Дзмітрый
ЛАЎРЫНОВІЧ

# Дзейнасць Прагрэсіўнага блока ў IV Дзяржаўнай думе



*Таўрычаскі палац.*

Дзейнасць Дзяржаўнай думы з'яўляецца важнай крыніцай вывучэння вопыту сістэмы парламентарызму ў Расіі. Асаблівую цікавасць выклікае Прагрэсіўны блок – апазіцыйнае аб'яднанне большасці фракцый IV Дзяржаўнай думы і часткі груповак Дзяржаўнага савета, якое існавала са жніўня 1915 г. па люты 1917 г.

Яшчэ ў 1940-я гг. з'явіліся першыя, няхай не зусім грунтоўныя, спробы разгляду названай вышэй праблемы[1]. Стварэнне блока, яго праграма і дзейнасць у той ці іншай ступені аналізаваліся ў працах гісторыкаў В.С.Дзякіна і Я.Д.Чэрменскага[2]. У 1975 г. была выдадзена манаграфія А.Р.Слонімскага, у якой асвятляецца апошні этап дзейнасці Прагрэсіўнага блока, прычым у асноўным яго кадэцкай часткі[3]. Дадзены артыкул з'яўляецца спробай сучаснага погляду на праблему.

Уступленне Расіі ў першую сусветную вайну буржуазна-памешчыцкія фракцыі Дзяржаўнай думы сустрэлі ў эйфарыі "патрыятычнага ўздыму". Настрой некаторай часткі грамадства добра перадаў у сваёй прамове на адным з пасяджэнняў Думы дэпутат ад Магілёўскай губерні акцябрыст В.С.Дрыбінцаў. Ён заявіў: "Цяпер не павінна быць і, безумоўна, не будзе варожасці ні племянной, ні саслоўнай, ні партыйнай... Мы сваёй працай павінны звязаць сябе нябачнымі ніцямі з нашай дарагой арміяй і даказаць ёй нашу гатоўнасць ісці на ўсялякія ахвяры і клопаты аб барацьбітах за Радзіму"[4]. 26 ліпеня 1914 г. на аднадзённай сесіі Думы дэпутаты заявілі пра поўную падтрымку ўрада і пра неабходнасць унутранага міру ў краіне.

Аднак вясной 1915 г. "патрыятычны ўздым" змяніўся "патрыятычнай трывогай". Германа-аўстрыйскае наступленне паставіла пад пагрозу не толькі рэалізацыю задач расійскіх кіруючых колаў у вайне, але і магчымае выйсце з яе без істотных страт для краіны. Крызіс забеспячэння войскаў выявіў непадрыхтаванасць дзяржавы да зацяжных ваенных дзеянняў. Адказнасць за гэта не без падстаў ускладалася думцамі і грамадскасцю на Кабінет міністраў.

Начальнік Петраградскага ахоўнага аддзялення ў данясенні дэпартаменту паліцыі пісаў, што 19 ліпеня 1915 г., калі адкрылася сесія ніжняй палаты, пачалі ладзіцца перагаворы аб пагадненні паміж рознымі фракцыямі Дзяржаўнай думы і Дзяржаўнага савета з



*ЛАЎРЫНОВІЧ Дзмітрый Сяргеевіч – аспірант кафедры гісторыі Расіі БДУ. Нарадзіўся ў 1976 г. у г. п. Шуміліна Віцебскай вобл., дзе скончыў сярэднюю школу № 1. У 1993 г. паступіў на гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова, пасля заканчэння якога ў 1998 г. быў пакінуты на працу асістэнтам кафедры ўсходнеславянскай і расійскай гісторыі. Займаецца праблемамі барацьбы за ўладу ліберальна-кансерватыўнага блока ў Расійскай імперыі (1915–1917 гг.). Аўтар больш за 10 навуковых і навукова-папулярных прац.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мэтай стварэння апазіцыйнага парламенцкага блока[5]. Такое пагадненне было канчаткова заключана 22 жніўня, а падпісана 25 жніўня.

Прагрэсіўны блок аб'яднаў 6 думскіх фракцый: кадэтаў (52 дэпутаты, лідэр П.М.Мілюкоў), прагрэсістаў (32 дэпутаты, лідэр І.М.Яфрэмаў), фракцыю "Союза 17 октября" (22 дэпутаты, лідэр С.І.Шыдлоўскі), земцаўакцябрыстаў (65 дэпутатаў, лідэр І.І.Дэмітрукоў), групу цэнтра (33 дэпутаты, лідэр У.М.Львоў), прагрэсіўных нацыяналістаў (30 дэпутатаў, лідэр У.А.Бобрынскі)[6], а таксама некаторых прадстаўнікоў іншых фракцый. Паводле падлікаў Я.Д.Чэрменскага, у блок увайшлі 236 дэпутатаў з 442 членаў Думы. Акрамя таго, думскую большасць звычайна падтрымлівалі (аддавалі ёй свае галасы) нацыянальныя групы – беларуска-літоўска-польская (6 чалавек), польскае кола (6 чалавек), мусульманская (6 чалавек) і незалежных дэпутатаў (14 чалавек). На думку Я.Чэрменскага, блок меў 268 галасоў супраць 52 галасоў правых і 57 галасоў нацыянальнай фракцыі, гэта значыць дзве трэці ад усяго складу Думы. Аднак, паводле сведчання сучасніка тых падзей загадчыка Міністэрскага павільёна Л.К.Куманіна, колькасны склад фракцый не быў пастаянным[7]. У Прагрэсіўны блок уступілі і тры групы верхняй палаты – Дзяржаўнага савета: цэнтра (лідэр У.У.Мелер-Закамельскі), акадэмічная (лідэр Д.Д.Грым) і пазапартыйнага аб'яднання. Усяго ён аб'яднаў каля 316 дэпутатаў расійскага парламента[8]. На працягу некалькіх гадоў лідзіруючай фракцыяй у блоку была кадэцкая. Яе кіраўнік П.Мілюкоў вызначаў тактыку думскай большасці.

Чаму менавіта летам 1915 г. стала магчымым заключэнне такога шырокага пагаднення паміж думскімі партыйнымі фракцыямі і пазапартыйнымі групоўкамі? На нашу думку, перш за ўсё трэба ўлічваць, што з пачаткам вайны ўзрасла эканамічная моц і палітычная кансалідацыя расійскай буржуазіі: к жніўню 1915 г. дзейнічалі Усерасійскі земскі саюз, Усерасійскі саюз гарадоў, ваенна-прамысловыя камітэты, розныя кааператыўныя арганізацыі. З другога боку – паражэнні расійскай арміі на франтах вясной–летам таго ж года паставілі Расію на мяжу нацыянальнай катастрофы. Адначасова пачаўся эканамічны крызіс. Неабходна было прадухіліць пагрозу новай рэвалюцыі.

Большасць Думы бачыла выйсце ў ідэі стварэння ўрада "народнага даверу". У чэрвені 1915 г. на канферэнцыі кадэцкай партыі ў Петраградзе па дадзенаму пытанню з найбольш рэзкай крытыкай урада І.Л.Гарамыкіна выступіў віленскі дэлегат Г.Ром. На яго думку, мала адзначыць няздольнасць урада справіцца з сітуацыяй у краіне, трэба гаварыць пра яго злачынную дзейнасць. Маючы на ўвазе нямецкі пагром у Маскве, які адбыўся ў маі бягучага года, Г.Ром заўважыў: "У Дзяржаўнай думе павінна быць прама выказана, што падрыхтоўваць пагромы замест клопату аб арміі злачынна"[9].

Нягледзячы на некаторыя істотныя адрозненні ў палітычных праграмах кадэтаў, акцябрыстаў і прагрэсістаў, паміж імі было шмат агульнага. Усе дэпутаты хацелі плённа працаваць у Дзяржаўнай думе, жадалі ўвесці ў жыццё законы аб дэмакратычных свабодах, усе былі незадаволены дзейнасцю царскага ўрада, лічылі, што "выратаваць Расію ад рэвалюцыі можа толькі прымірэнне гістарычнай улады (манархіі на чале з Мікалаем ІІ. – **Д.Л.**) з лібералізмам, гэта значыць сапраўднае ператварэнне самадзяржаўя ў канстытуцыйную манархію"[10]. Дэпутат ад Гродзенскай губерні прагрэсіст Ф.І.Лашкейт сцвярджаў, што немагчыма развіваць вытворчыя сілы краіны ў тых межах, якія стварыў Савет міністраў[11].

Ідэю змены ўрада падзялялі таксама група цэнтра і невялікая частка дэпутатаў з фракцыі нацыяналістаў. Патрабаванне большасці Дзяржаўнай думы знайшло падтрымку і ў апазіцыйных дзеячаў Дзяржаўнага савета. "Адзінае, што нас можа аб'яднаць – вызначыць шляхі і спосабы дайсці да мэты – паставіць каля руля праўлення адпаведнага чалавека", – адзначаў член Дзяржаўнага савета У.І.Гурко на нарадзе з прадстаўнікамі думскіх фракцый[12]. Трэба мець на ўвазе, што правыя ўвайшлі ў склад Прагрэсіўнага блока для таго, каб надаць апазіцыі больш кансерватыўны характар, нейтралізаваць яе радыкальныя элементы – кадэтаў і прагрэсістаў.

Да фактараў, якія садзейнічалі стварэнню Прагрэсіўнага блока, трэба аднесці і тое, што дзейнасць грамадскіх арганізацый і парламента знайшла падтрымку з боку Антанты. "Нарэшце Расія на правільным шляху...", – пісаў французскі пасол М.Палеалог у сваім дзённіку з прычыны выступлення Г.Я.Львова на Усерасійскім земскім з'ездзе ў Маскве. У яго прамове адзначалася неабходнасць умяшання прадстаўнікоў грамадскасці ў арганізацыю абароны краіны[13]. Апрача таго, стварэнне Прагрэсіўнага блока паскорыла небяспека ўтварэння правай большасці Дзяржаўнай думы ў выглядзе так званага чорнага блока, які быў згодны падтрымліваць урад. Яшчэ 16 жніўня 1915 г. на нараду ў старшыні Савета міністраў І.Л.Гарамыкіна былі запрошаны прадстаўнікі фракцый ад крайне правых да акцябрыстаў уключна. І.Гарамыкін імкнуўся знайсці падтрымку па пытанню арганізацыі ў Дзяржаўнай думе праўрадавай большасці, але пацярпеў няўдачу[14].

Галоўным патрабаваннем Прагрэсіўнага блока было стварэнне "міністэрства даверу": "...толькі моцная, цвёрдая і дзейная ўлада можа прывесці Айчыну да перамогі, і такой можа быць толькі ўлада, якая абапіраецца на народнае давер'е і здольная арганізаваць актыўнае супрацоўніцтва ўсіх грамадзян". Для стварэння такой улады неабходна было, згодна з праграмай блока, выкананне дзвюх умоў: першая – "стварэнне аб'яднанага ўрада з асоб, якія ... згодны з заканадаўчымі ўстановамі адносна выканання ў бліжэйшы тэрмін пэўнай праграмы"; другая – змяненне прыёмаў кіравання краінай[15].

У Расіі не было ўрада як кіруючага органа ў заходнееўрапейскім сэнсе гэтага слова. Міністры Мікалая ІІ былі не палітыкі, а чыноўнікі, слугі цара. У лідэраў Прагрэсіўнага блока, наадварот, стварэнне "міністэр-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ства даверу" азначала аб'яднаны ўрад – Кабінет міністраў з незалежным ад носьбіта вярхоўнай улады прэм'ерам-міністрам і з палітычнай праграмай на платформе думскай большасці. Ва ўмовах ваеннага часу і эканамічнага крызісу "міністэрства даверу" атрымала б, на думку лібералаў, надзвычайныя паўнамоцтвы. "Патрэбна рэформа ўлады... Неабходна надзяленне ўрада асобымі паўнамоцтвамі. Дыктатура ўрада...", – гаварылася на нарадах думцаў пры стварэнні Прагрэсіўнага блока[16].

Лібераламі былі падрыхтаваны і спісы мяркуемых членаў будучага ўрада. Спачатку мелася на ўвазе ўключыць у "міністэрства даверу" толькі найбольш актыўных палітычных і грамадскіх дзеячаў. Потым было вырашана сфарміраваць Кабінет і з удзелам ліберальных міністраў А.А.Паліванава, С.Д.Сазонава, А.В.Крывашэіна і інш. Потым у спіс кандыдатаў ва ўрад былі ўключаны больш левыя, і на пачатку 1916 г. дзяржаўных асоб у ім зноў ужо не было. Хоць і намячаліся кандыдатуры будучых міністраў, адначасова вяліся спрэчкі пра так званы візірат, калі прэм'ер-міністр падбіраў сабе каманду па ўласным меркаванні[17]. Вылучаліся розныя кандыдатуры ў будучыя кіраўнікі "міністэрства даверу". Левае крыло блока прапанавала Г.Я.Львова, А.І.Гучкова, М.У.Радзянку; памяркоўныя – галоўнага кіраўніка землеўпарадкавання і земляробства А.Крывашэіна; правыя – дзяржаўнага сакратара С.Я.Крыжаноўскага[18]. Пад ціскам акцябрыстаў большасць думы схілялася на карысць М.Радзянкі, але кадэты агітавалі за Г.Львова. Сучасны даследчык Б.М.Вітэнберг лічыць, што аб'яднаная апазіцыя і ў 1917 г. выступала з двума лідэрамі – Г.Львовым і М.Радзянкам[19].

Чым жа лозунг "міністэрства даверу" ў адрозненне ад патрабавання "адказнага міністэрства" так прыцягваў кадэтаў? У гэтым лозунгу партыя народнай свабоды бачыла найбольш верагодны шлях заваявання палітычнай улады ў краіне. "Шэры кардынал" акцябрыстаў Н.В.Савіч пазней адзначаў, што "...пад такую форму можна было пры жаданні падвесці і чыста думскае міністэрства, і такое, што, будучы адказным толькі перад манархам, складалася б з асоб, якія карыстаюцца павагай і даверам вядомых колаў грамадства". Пад яе падыходзіў Кабінет Г.Львова, "...які ўжо тады імі (кадэтамі) лабіраваўся і які ніколі не атрымаў бы ў Думе неабходнай большасці". Н.Савіч лічыў, што тая партыя, якая возьме на сябе кіраўніцтва "міністэрствам даверу" і давядзе вайну да паспяховага завяршэння, будзе мець на наступных выбарах вялікія шанцы на поспех"[20]. Па суадносінах сіл у Думе такой партыяй пры "адказным міністэрстве" была б партыя акцябрыстаў, але гэта зусім не ўваходзіла ў планы кадэтаў. П.Мілюкоў пісаў: "Дастаткова сабе ўявіць, чым было б адказнае міністэрства пры правай большасці IV Дзяржаўнай Думы..."[21]. Будучы ўрад, на думку кадэцкага лідэра, павінен быў стаць хутчэй за ўсё органам пазадумскіх грамадскіх арганізацый, у якіх пераважалі лібералы: кадэты, прагрэсісты, левыя акцябрысты.

Праграма Прагрэсіўнага блока першапачаткова прадугледжвала забеспячэнне законнасці ў кіраванні, ліквідацыю двоеўладдзя ваенных і грамадзянскіх устаноў, абнаўленне складу мясцовай адміністрацыі і іншыя меры. Асноўны яе тэкст складаўся з адміністрацыйнай і заканадаўчай частак. Прадугледжваліся наступныя адміністрацыйныя меры: шырокая палітычная і рэлігійная амністыя асоб, не вінаватых у злачынствах агульнакрымінальнага характару (за выключэннем тэрарыстаў); спыненне праследаванняў за веру і адмена цыркуляраў, якія абмяжоўваюць дзеянне ўказа Мікалая ІІ ад 17 красавіка 1905 г. аб свабодзе веравызнання; дазвол дзейнасці прафсаюзаў; спыненне праследаванняў рабочых за ўдзел у рабоце бальнічных кас і аднаўленне дэмакратычнага друку.

У асноўных палажэннях праграмы думская большасць закранула таксама нацыянальнае пытанне. Па польскаму пытанню прадугледжваліся адмена абмежаванняў у правах палякаў на тэрыторыі ўсёй Расійскай імперыі, распрацоўка законапраекта аб аўтаноміі Царства Польскага, перагляд палажэнняў аб польскім землеўладкаванні. Апошні пункт спецыяльна не тлумачыўся, таму што дэпутаты не прыйшлі да адзінай думкі па праблеме зняцця абмежаванняў на правы землеўладання для палякаў. Дэпутаты жадалі правесці ў Фінляндыі перамены ў складзе адміністрацыі і сената, спыніць праследаванне службовых асоб. Праграма блока змяшчала таксама палажэнне аб паляпшэнні становішча яўрэяў праз скасаванне мяжы яўрэйскай аселасці, адмене абмежаванняў пры паступленні іх у навучальныя ўстановы, аб дазволе займацца ўсімі відамі прафесійнай дзейнасці, аднаўленні яўрэйскага друку. Па ўкраінскім пытанні прадугледжваліся вызваленне арыштаваных і сасланых уніятаў (рэпрэсіраваных падчас акупацыі ў 1914–1915 гг. Галіцыі расійскай арміяй. – **Д.Л.**), аднаўленне друку на ўкраінскай мове[22].

Нягледзячы на тое, што два дэпутаты ад Беларусі ўвайшлі ў Прагрэсіўны блок, пытанні, якія тычыліся навучання на беларускай мове ў навучальных установах, выхаду беларускамоўных газет, не былі адлюстраваны ў яго праграме. Прадстаўнікі фракцый нацыяналістаў, акцябрыстаў і прагрэсістаў былі прыхільнікамі ідэі захавання "адзінай і непадзельнай Расіі". Яны не прызнавалі існавання беларускага народа як самастойнага этнасу, а беларускую мову лічылі дыялектам рускай. Што тычыцца беларуска-літоўска-польскай групы, то, на думку даследчыка Ю.Весялоўскага, усе "... гэтыя краёўцы – шляхта, памешчыкі і большасць католікаў, якія выйшлі з беларускага народу, не засталіся яму вернымі. Яны больш кіраваліся сваім багаццем... і ў канцы апынуліся ў польскім асяроддзі"[23]. Сучасныя беларускія гісторыкі катэгарычна сцвярджаюць, што "... сапраўдных абаронцаў сацыяльных і нацыянальных правоў беларускага народа ў чацвёртай Думе не было"[24].

Заканадаўчыя меры, прапанаваныя блокам, дзяліліся на ваенныя і грамадзянскія. Так, у праграме ўказвалася на неабходнасць хутчэйшага правядзення

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



*Пасяджэнне Дзяржаўнага савета ў Марыінскім палацы.*
Пецярбург, 1908 г.



*Дэпутат Дзяржаўнай думы, лідэр фракцыі кадэтаў П.М.Мілюкоў выступае з прамовай.* 1915 г.



*Дэпутат Дзяржаўнай думы, лідэр фракцыі прагрэсіўных нацыяналістаў В.В.Шульгін.*



*Пасяджэнне IV Дзяржаўнай думы ў Таўрычаскім палацы.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



*Дэпутат
Дзяржаўнай думы,
лідэр фракцыі прагрэсіўных
нацыяналістаў
У.А.Бобрынскі.*



*Дэпутат Дзяржаўнай думы,
лідэр фракцыі прагрэсістаў
І.М.Яфрэмаў.*



*Старшыня IV Дзяржаўнай
думы акцябрыст
М.У.Радзянка.*



*Старшыня Часовага ўрада
князь Г.Я.Львоў.*



*Лідэр партыі
"Союз 17 октября"
А.І.Гучкоў, адзін
з кандыдатаў у кіраўнікі
"міністэрства даверу".*



*Дэпутат
Дзяржаўнай
думы
акцябрыст
С.І.Шыдлоўскі,
афіцыйны
лідэр
Прагрэсіўнага
блока.*



*Старшыня
Савета міністраў
Б.У.Шцюрмер.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

законапраектаў па нацыянальнай абароне, забеспячэнні арміі і дапамогі параненым, уладкаванні бежанцаў і іншых пытаннях. З мэтай захавання ўнутранага міру прадугледжвалася прадастаўленне сялянам роўных правоў з іншымі саслоўямі, увядзенне валаснога земства, пашырэнне правоў органаў мясцовага самакіравання, паўсюднае ўвядзенне міравога суда, забеспячэнне выканання "сухога" закона[25].

Палітычная невыразнасць асноўнай часткі праграмы думскай большасці тлумачыцца тым, што пагадненне заключалася перш за ўсё па пытаннях аб "міністэрстве даверу", змене ўрада. Для дасягнення адзінства па гэтай праблеме лідэры фракцый спецыяльна надалі палажэнням адміністрацыйнай і заканадаўчай частак праграмы агульны характар, прымальны для ўсіх дэпутатаў – ад кадэтаў да прагрэсіўных нацыяналістаў. "Праграма Прагрэсіўнага блока – гэта праграма цяперашняга дня, і ў выпадку спазнення з рэформамі яна стане недастатковай"[26], – адзначалі прадстаўнікі думскай большасці. Сапраўды, восеню наступнага года фракцыя прагрэсістаў вырашыла вярнуцца да больш радыкальнага, як яны лічылі, патрабавання "адказнага міністэрства" і выйшла са складу аб'яднанай думскай апазіцыі. Аднак яна працягвала падтрымліваць барацьбу большасці Дзяржаўнай думы з урадам.

Найбольшая актыўнасць апазіцыйнай дзейнасці Прагрэсіўнага блока прыпадае на асенне-зімовую сесію 1916 г. (так званы штурм улады). 1 лістапада з рэзкай прамовай у парламенце выступіў П.Мілюкоў. Кожнае палажэнне ён завяршаў рытарычным пытаннем: "Што гэта – глупства ці здрада?". П.Мілюкоў патрабаваў неадкладнай адстаўкі ўрада, пры гэтым ён прыраўноўваў яе да перамогі ў вайне. Прамова завяршалася запэўніваннем у гатоўнасці Прагрэсіўнага блока змагацца з Саветам міністраў да поўнага дасягнення "сапраўднай адказнасці ўрада"[27]. З боку лідэра кадэтаў гэты заклік, напэўна, быў своеасаблівым рэверансам да прагрэсістаў. У выніку "штурму", 10 лістапада адправілі ў адстаўку старшыню Савета міністраў Б.У.Шцюрмера.

Выступленне П.Мілюкова атрымала негатыўную ацэнку з боку ўлады. Было забаронена яго друкаваць, і яно распаўсюджвалася неафіцыйна. Падкрэсліваючы значэнне прамовы лідэра кадэтаў, сведка гэтых падзей гісторык С.П.Мельгуноў адзначаў: "Калі не з 1 лістапада "папаўзло" слова пра "здраду", то з гэтага часу яно быццам бы атрымала грамадскую санкцыю"[28]. Выступленні лідэраў Прагрэсіўнага блока ў Думе – П.Мілюкова, В.А.Маклакова, В.В.Шульгіна і іншых, а таксама распаўсюджванне іх прамоў адыгралі вялікую ролю ў радыкалізацыі грамадскай думкі напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі.

Падчас паўстання рабочых і салдат у Петраградзе 27 лютага 1917 г. членамі Дзяржаўнай думы быў створаны Часовы камітэт. У яго склад першапачаткова ўвайшлі 12 дэпутатаў: былыя члены Прагрэсіўнага блока, а таксама прадстаўнікі ад левых – А.Ф.Керанскі і М.С.Чхеідзе. Старшынёй камітэта абралі М.Радзянку. В.Шульгін трапна адзначыў, што Часовы камітэт Дзяржаўнай думы быў тым жа бюро Прагрэсіўнага блока, толькі пашырыўся ўлева[29]. Экс-апазіцыянеры наладзілі выданне свайго друкаванага органа: вечарам 27 лютага выйшаў першы нумар "Вестей Комитета петроградских журналистов". Удзельнік рэвалюцыйных падзей лютага 1917 г. М.М.Суханаў называў гэта выданне "рупарам Прагрэсіўнага блока"[30].

Вечарам 27 лютага ў Таўрычаскім палацы пачаў работу яшчэ адзін орган, які прэтэндаваў на ўладу і кіраўніцтва рэвалюцыяй – Петраградскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Саветам і Часовым камітэтам Думы была наладжана работа сумесных камісій – ваеннай (Б.А.Энгельгард) і харчовай (А.І.Шынгароў), старшынямі іх былі былыя дэпутаты Прагрэсіўнага блока. Сацыялісты, якія ўваходзілі ў Петраградскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, вымушаны былі лічыцца з інтарэсамі паралельнага органа ўлады, бо яны не ўяўлялі сабе перамогі рэвалюцыі без далучэння да яе буржуазіі. "Уся наяўная дзяржаўная машына, армія чыноўніцтва, цэнзавыя земствы і гарады, якія працавалі пры садзейнічанні ўсіх сіл дэмакратыі, маглі быць паслухмянымі Мілюкову, але не Чхеідзе", – пісаў М.Суханаў[31]. Першая рэвалюцыйная ўлада, на яго думку, павінна была быць буржуазнай.

Як жа ствараўся Часовы ўрад? В.Шульгін пісаў: "Паміж бясконцых размоў з тысячамі людзей, якія хапалі яго (П.Мілюкова. – **Д.Л.**) за рукаў, прыняццем дэпутацый, прамоў на бясконцых мітынгах, ...вар'яцкай язды па палках, абмеркавання тэлеграм са Стаўкі, грызні з узрастаючай нахабнасцю "выканкама" – Мілюкоў, прысеўшы на хвілінку дзесьці на ражку стала, пісаў спіс міністраў..."[32]. Наўрад ці лідэр кадэтаў выдумляў дадзены спіс "на ражку стала", хутчэй за ўсё ён уносіў у яго карэктывы. Сам П.Мілюкоў не лічыў першы склад Часовага ўрада выпадковым. Спачатку лібералы вырашылі прытрымлівацца спісаў лідэраў думскай большасці, складзеных у 1915–першай палове 1916 гг. "Самы правы з блока, В.В.Шульгін, – на думку П.Мілюкова, – мог бы ўвайсці ва ўрад, калі б захацеў, але ён вырашыў застацца... пры сваёй прафесіі публіцыста"[33].

Сапраўды, першы склад Часовага ўрада быў амаль выключна з членаў Прагрэсіўнага блока. Але ў яго неспадзявана ўвайшлі два новыя члены – А.Ф.Керанскі і М.І.Цярэшчанка. Кадэт У.Д.Набокаў, кіраўнік спраў Часовага ўрада, вельмі здзівіўся, калі даведаўся, што міністрам юстыцыі замест В.Маклакова, якога намячалі раней, стаў А.Керанскі[34]. П.Мілюкоў тлумачыў членства А.Керанскага ва ўрадзе той роляй, якую ён адыграў у дні Лютаўскай рэвалюцыі, а таксама неабходнасцю заручыцца ў яго асобе "падтрымкай дэмакратыі". "Заложнікам дэмакратыі" ў першым Часовым урадзе называў сябе і сам А.Керанскі. Але ўключэнне ў спіс міністраў М.Цярэшчанкі і ігнараванне А.Керанскім забароны Петраградскім Саветам на ўваход яго членаў у буржуазны ўрад дазваляюць меркаваць, што галоўную ролю тут хутчэй за ўсё адыграла прыналежнасць абодвух "навічкоў" да масонскай арганіза-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цыі. На гэта ўскосна ў сваіх успамінах указвае і П.Мілюкоў, гаворачы пра дамінаванне ў Часовым урадзе так званай чацвёркі: А.Керанскага, М.Цярэшчанкі, М.В.Някрасава і А.І.Канавалава. Усе яны належалі да кіраўніцтва масонскай арганізацыі "Вялікі Усход народаў Расіі"[35]. Хутчэй за ўсё менавіта над уключэннем двух першых з іх ва "ўрад Прагрэсіўнага блока" і думаў П.Мілюкоў, калі В.Шульгін бачыў, як ён сядзеў "на ражку стала". Пазней кадэцкі лідэр прызнаваў, што стварэнне Часовага ўрада не было ўжо "чыстай лініяй" думскай большасці[36].

Наступным пытаннем, якое павінны былі вырашыць былыя апазіцыянеры, было пытанне пра лёс цара. Адрачэнне Мікалая II адбылося 2 сакавіка, а на наступны дзень адмовіўся ад трона вялікі князь Міхаіл Аляксандравіч. Праект маніфеста пра адрачэнне апошняга быў напісаны М.Някрасавым, пасля тэкст адрэдагавалі У.Набокаў, Б.Нольдэ і В.Шульгін. Маніфест вызначыў паўнамоцтвы Часовага ўрада, яго адносіны да Дзяржаўнай думы: уся ўлада, што належала манарху, павінна была лічыцца перададзенай не Думе, а Часоваму ўраду. Апошні надзяляўся ўсёй паўнатой не толькі выканаўчай, але і заканадаўчай, і судовай улады. А значыць узнікала пытанне пра мэтазгоднасць існавання Часовага камітэта Дзяржаўнай думы, а таксама ўзнаўлення пасяджэнняў парламента ўвогуле. Такое развіццё атрымала кадэцкая ідэя пазадумскага "міністэрства даверу". Нейкі час правыя члены былой думскай большасці яшчэ збіраліся на прыватныя нарады. Нарэшце 6 кастрычніка 1917 г. Часовы ўрад афіцыйна распусціў Дзяржаўную думу.

---

1 Грунт А.Я. "Прогрессивный блок" // Вопросы истории, 1945, № 3-4; Климов И.М. Программа и тактика Прогрессивного блока. М., 1947.

2 Дякин В.С. Русская буржуазия и царизм в годы первой мировой войны (1914–1917). Л., 1967; Ён жа. Что такое "Прогрессивный блок" (Объединение буржуазно-помещичьих фракций в IV Государственной думе. Ответ на письма в редакцию) // Вопросы истории, 1970, № 1; Черменский Е.Д. IV Государственная дума и свержение царизма в России. М., 1976.

3 Слонимский А.Г. Катастрофа русского либерализма: Прогрессивный блок накануне и во время Февральской революции 1917 г. Душанбе, 1975; Ён жа. "Звездный час" русского либерализма // Вопросы истории, 1977, № 11.

4 Слобожанин В.П. Земское самоуправление в Белоруссии (1905–1917 гг.). Мн., 1994, с. 68.

5 Буржуазия накануне Февральской революции. М.-Л., 1927, сс. 26–27.

6 Падлічана па: Спирин Л.М. Крушение помещичьих и буржуазных партий в России. М., 1977, сс. 340–341.

7 Черменский Е.Д. IV Государственная дума и свержение царизма в России, с. 112; Донесения Л.К. Куманина из Министерского павильона Государственной думы, декабрь 1911–февраль 1917 года // Вопросы истории, 1999, № 3, сс. 15–16; 1999, № 10, сс. 21, 22, 28.

8 В Государственной думе // Утро России, 1915, 25 августа, с. 3.

9 Кадеты в дни Галицийского разгрома 1915 г. // Красный архив, 1933, т. 59, с. 127.

10 Маклаков В.А. Власть и общественность на закате старой России (Воспоминания современника) // Российские либералы: кадеты и октябристы. М., 1996, с. 231.

11 Забаўскі М.М., Пуцік У.С. Прадстаўніцтва ад Беларусі ў Дзяржаўнай думе Расіі (1906–1917 гг.). Мн., 1998, с. 56.

12 Прогрессивный блок в 1915–1917 гг. // Красный архив, 1932, т. 50–51, с. 123.

13 Палеолог М. Царская Россия во время мировой войны. М., 1991, с. 182.

14 Черный блок // Утро России, 1915, 16 августа, с. 2.

15 Программа "Прогрессивного блока" // Российские либералы: кадеты и октябристы, с. 76.

16 Прогрессивный блок в 1915–1917 гг. // Красный архив, 1932, т. 50–51, с. 124.

17 Там жа, с. 151.

18 В Государственной думе // Утро России, 1915, 14 августа, с. 3; В Государственной думе // Русские ведомости, 1915, 30 августа, с. 3.

19 Интеллигенция у власти: Временное правительство в 1917 году. Международный семинар историков в Санкт-Петербурге // Отечественная история, 1999, № 4, с. 104.

20 Савич Н.В. Воспоминания. СПб., 1993, с. 164.

21 Кадеты в дни Галицийского разгрома 1915 г., с. 119.

22 Программа "Прогрессивного блока", сс. 76–77.

23 Весялоўскі Ю. Беларусь у Першай Сусьветнай вайне (Гістарычны нарыс) // Рэд. А.Мірановіч. Беласток-Лёндан, 1996, с. 25.

24 Забаўскі М.М., Пуцік У.С. Прадстаўніцтва ад Беларусі ў Дзяржаўнай думе Расіі (1906–1917 гг.), с. 56.

25 Программа "Прогрессивного блока", сс. 76–77.

26 Совещание на квартире П.А.Харитонова // Утро России, 1915, 29 августа, с. 2.

27 Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (г. Санкт-Пецярбург), ф. 1278, воп. 5, спр. 266, а. 108.

28 Мельгунов С.П. На путях к дворцовому перевороту. Париж, 1979, с. 75.

29 Шульгин В.В. Годы. Дни. 1920 год. М., 1990, с. 444.

30 Суханов Н.Н. Записки о революции. В 3-х т. Т. 1. М., 1991, с. 112.

31 Там жа, с. 51.

32 Шульгин В.В. Годы. Дни. 1920 год, с. 487.

33 Милюков П.Н. Война и вторая революция: Пять дней революции (27 февраля–3 марта) // Страна гибнет сегодня: Воспоминания о Февральской революции 1917 г. М., 1991, с. 20.

34 Набоков В.Д. Временное правительство // Страна гибнет сегодня: Воспоминания о Февральской революции 1917 г., с. 374.

35 Русское политическое масонство. 1906–1918 гг.: Документы из архива Гуверовского института войны, революции и мира // История СССР, 1989, № 6, с. 121; 1990, № 1, сс. 148–149.

36 Милюков П.Н. Воспоминания (1859–1917). В 2-х т. Т. 2. М., 1990, с. 250.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова